Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

6 САКАВІКА 2008 г. ЧАЦВЕР
№ 44 (26157)
Кошт 430 рублёў
ВЫДАЕЦЦА 3 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## ПЕНСІЙНАЯ ТЭМА: ЯКІЯ ПРАБЛЕМЫ?



Вылічэнне стажу і каэфіцыенту, магчымасць пераходу з аднаго віду пенсіі на іншы, ільготы «датэрміноўшчыкам», змяненні ў пенсійным заканадаўстве — усё гэта стане тэмамі чарговай «прамой лініі» газеты «Звязда» з удзелам начальніка галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціны Вікенцьеўны КАРАЛЁВАЙ.

Такім чынам, увага! Згодна з папярэдняй дамоўленасцю, наша «прамая лінія» будзе праходзіць **11 сакавіка з 11.00 да 12.30** па рэдакцыйных тэлефонах (8 017) 292 38 21 і 292 38 92. Папярэднія званкі прымаюцца па нумары 287 17 57.

Падрабязнасці

## ДРУГАЯ ВЫШЭЙШАЯ АДУКАЦЫЯ — ТАКСАМА ПРАЗ ПРАФЕСІЙНЫ АДБОР

**5 сакавіка ў беларускіх ВНУ распачалася рэгістрацыя абітурыентаў для праходжання прафесійна-псіхалагічнай гутаркі. У Беларускім дзяржаўным універсітэце прагназуюць, што колькасць ахвотных прайсці гутарку менавіта ў БДУ, можа перавысіць 2 тысячы чалавек.**

— Уся справа ў тым, што прайсці праз папярэдні прафадбор павінны будуць не толькі абітурыенты, якія плануюць паступаць на дзённую бюджэтную форму навучання, але і вячэрнікі, завочнікі, платнікі, грамадзяне, якія збіраюцца паступаць на скарочаныя тэрміны навучання, паралельнае навучанне, на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі, а таксама ахвотныя атрымаць другую вышэйшую адукацыю, — паведаміла на сустрэчы з журналістамі адказны сакратар прыёмнай камісіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Людміла Хухлындзіна. — Да таго ж у Белдзяржуніверсітэце ажыццяўляецца падрыхтоўка па 7 з 10 спецыяльнасцяў, дзе Правіламі прыёму прадугледжана правядзенне прафесійна-псіхалагічнай гутаркі.

Хоць для таго, каб паступіць у Белдзяржуніверсітэт, зусім неабавязкова ехаць для праходжання гутаркі ў Мінск, зрабіць гэта можна і бліжэй да дому. Выключэнне складаюць толькі спецыяльнасці «міжнародныя адносіны» і «міжнароднае права».

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

## СА «ЗВЯЗДОЙ» — У НОВЫМ ГОДЗЕ!

**Працягваецца падпіска на II квартал і I паўгоддзе 2008 года. Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)**

| *Індэкс* | *на 1 месяц* | *на 3 месяцы* | *на 6 месяцаў* |
|---|---|---|---|
| **63850 (індывідуальны)** | **8800** | **26400** | **52800** |
| **63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)** | **8300** | **24900** | **49800** |
| **63858 (ведамасны)** | **14000** | **42000** | **84000** |
| **63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)** | **12800** | **38400** | **76800** |

### ГРАМАДЗЯНЕ БЕЛАРУСІ Ў 2007 ГОДЗЕ ЗАКЛЮЧЫЛІ 4588 ШЛЮБАЎ З ІНШАЗЕМЦАМІ

Кожны дваццаты шлюб, зарэгістраваны ў Беларусі ў мінулым годзе, быў заключаны з іншаземцамі, паведамілі ў Міністэрстве статыстыкі і аналізу. Абмяняліся заручальнымі пярсцёнкамі 4 тыс. 588 пар маладых, звязаўшы свой лёс з грамадзянамі замежных краін. У 2006 годзе такіх «змешаных» пар было менш — 4 тыс. 102. Часцей за ўсё выбар нашы суайчыннікі спыняюць на грамадзянах Расіі і Украіны.

**БЕЛТА.**

белагропромбанк
традыцыі будучага

ПОБЕДИТЕЛЬ КОНКУРСА «БРЭНД ГОДА 2007»

**ВНИМАНИЮ АКЦИОНЕРОВ ОТКРЫТОГО АКЦИОНЕРНОГО ОБЩЕСТВА «БЕЛАГРОПРОМБАНК»**

**Уважаемые акционеры!**

В связи с изменением законодательства Республики Беларусь, регулирующего вопросы учета ценных бумаг, расширен перечень обязательной информации, которая должна содержаться в анкетах акционеров — физических лиц, в частности:

- полный адрес (место жительства);
- паспортные данные (серия, номер, наименование органа, выдавшего документ, дата выдачи, личный номер).

Для сверки сведений и заполнения недостающих вышеуказанных данных просим акционеров банка — физических лиц обратиться в ближайшие учреждения ОАО «Белагропромбанк» по месту жительства или в депозитарий ценных бумаг банка для предоставления необходимых сведений. Депозитарий банка расположен по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, 24, кабинет 704.

**Ждем Вас с 9.00 до 17.00 в рабочие дни, пятница и предпраздничные дни — до 15.30.**

**При себе необходимо иметь паспорт.**

**Телефоны для справок: (8 017) 250 60 02, 228 53 00.**

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ от 27.10.2006 № 2 УНП 190706757

## Сяброўка «Звязды»



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**22 гады, якія Алена ЕРМАЧОНАК працуе ў паштовым аддзяленні вёскі Аздзяцічы Барысаўскага раёна, у яе працоўнай сумцы трывала прапісалася і газета «Звязда». Асабліва шануюць яе жыхары вёскі Лаўнікі, сярод якіх даўнія падпісчыкі на нашу газету Клаўдзія КАПЫЛЬСКАЯ і Любоў ЧАРНУХА.**

## Футбольная вясна стартавала

**Ужо стала традыцыяй, што з прыходам вясны ў сталіцы распачынаецца вялікі футбол. Учора ў футбольным манежы стартаваў IV міжнародны турнір па футболе на прызы УПП «Дарыда» і газеты «Звязда».**

Сёлета ў спаборніцтвах бярэ ўдзел шэсць каманд, пяць з якіх прадстаўляюць клубы вышэйшай лігі нацыянальнага першынства — «Дарыда» (Мінскі раён), «Смаргонь», МТЗ-РІПА (Мінск), «Нафтан» (г. Наваполацк), «Граніт» (г.Мікашэвічы), а таксама літоўскі футбольны клуб «Шаўляй».

Першы турнір на кубак «Дарыды» і газеты «Звязда» выйграў футбольны клуб БАТЭ, які перайграў у фінале «Дарыду». На наступны год ФК «Дарыда» ў фінале сустракалася са «Смаргонню» і таксама саступіла. Летась «мінеральная» дружына зноў-такі прабілася ў фінал, дзе традыцыйна саступіла, на гэты раз жодзінскаму «Тарпеда».

Сёлетні турнір адкрыў матч МТЗ-РІПА—«Шаўляй», дзе мінчане ўзялі верх з лікам 3:0. Спаборніцтвы выклікалі цікавасць і вядомых футбольных спецыялістаў і трэнераў — на трыбунах былі заўважаны галоўны трэнер юнацкай зборнай Аляксандр Хацкевіч (у кампаніі з Людасам Румбуцісам), галоўны трэнер нацыянальнай зборнай Бернд Штанге (ў адзіноце), Юрый Курненін, Георгій Кандрацьеў...

Спаборніцтвы адкрылі генеральны дырэктар УПП «Дарыда», дэпутат Палаты Прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір Дзялендзік, намеснік старшыні Мінскага райвыканкама Валянцін Емяльянаў, дэпутаты Палаты Прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Іван Семяненя і Мікалай Сергіенка, дырэктар УПП «Дарыда» Інэса Бурш, генеральны дырэктар ГА «АБФФ» Леанід Дмітраніца, галоўны суддзя спаборніцтваў Алег Чыкун. Ва ўступным слове дырэктар УПП «Дарыда» Інэса Бурш нагадала, што балельшчыкі засумавалі па футболе і чакаюць прыгожай гульні, пажадала ўдачы і перамогі мацнейшым. Дэпутат Палаты Прадстаўнікоў Іван Семяненя падкрэсліў, што 5 красавіка стартуе нацыянальны чэмпіянат па футболе і пажадаў камандам перамог, а балельшчыкам — відовішчных матчаў. Намеснік галоўнага рэдактара нашай газеты Анатоль Сланеўскі павіншаваў балельшчыкаў і ўдзельнікаў са стартам футбольнага сезона, які абяцае быць насычаным і багатым на матчы рознага ўзроўню. Віншуем і мы. Перамогі на кубку «Дарыды» і газеты «Звязда» пажадаем мацнейшаму, а прыз ад нашай газеты чакае свайго гаспадара.



**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

Як нас дураць

## КАЗАЧНЫЯ ПРАЦЭНТЫ ТОЯЦЬ НЕБЯСПЕКУ

### Расійская кампанія, прыцягнуўшы грошы ўкладчыкаў пад 25—50 працэнтаў гадавых, як і трэба было чакаць, загадала доўга жыць...

**Наша газета два месяцы таму пісала пра тое, якія рызыкі сёння падсцерагаюць беларусаў, якія з мэтай падзарабіць укладваюць свае сродкі ў расійскія паявыя інвестыцыйныя фонды. Прыцягнуўшы да размовы спецыяліста Нацыянальнага банка, мы, у прыватнасці, звярнулі тады ўвагу чытачоў на тое, што створаны ажыятаж вакол высокадаходных здавалася б укладанняў у некаторыя актывы можа ў выніку прывесці да поўнай страты грошай. Аднак, як кажуць, пакуль не грымне... Якраз цяпер і бабахнула, ды так, што з'явілася нагода, каб вярнуцца да ранейшай тэмы. Праўда, на гэты раз у «фінансавую піраміду» людзей уцягнула абяцаннямі аб казачна высокіх працэнтах санкт-пецярбургская фірма: тысячы расіян пацярпелі, уклаўшы ўласныя сродкі ў інвестыцыйны праект бізнэс-клуба «РуБін». Сярод пацярпелых, паводле некаторых звестак, у прыватнасці, такая інфармацыя была агучана расійскімі праваахоўнікамі, ёсць і грамадзяне Беларусі.**

Мяркуючы па папярэдняй інфармацыі, прайдзісветы хітра расставілі «пастку» для грамадзян, якія хочуць пабагацець. Асноўным відам сваёй дзейнасці яны заявілі «інвестыцыі і ўклады», а сродкі, сцвярджалі махляры, яны, маўляў, інвеставалі ў будаўнічы комплекс па дагаворах з будаўнічымі кампаніямі, якія перадаваліся вопытным брокерам. Апошнія, у сваю чаргу, «гарантавалі інвестарам высокую даходнасць на фінансавым рынку і на рынку каштоўных папер». Гучыць, пагадзіцеся, важка. Толькі вопытныя спецыялісты наўрад ці клюнулі б на такую прыманку. Напрыклад, беларускія эксперты гавораць пра тое, што для чалавека, які не мае спецыяльных ведаў па пытаннях абарачэння каштоўных папер і інвеставання, разабрацца ў такой «чахардзе» цяжка.

Фінансавая неадукаванасць толькі палягчала справу ліхадзеям. А вось чым «дабівалі» канчаткова сваіх патэнцыйных ахвяраў «пірамідчыкі» — гэта гарантаванай высокай даходнасцю ўкладанняў — ад 25 да 50 працэнтаў. Кліенты нават не звярталі ўвагі на тое, што ў кампаніі адсутнічалі афіцыйныя ліцэнзіі на прыцягненне сродкаў грамадзян і іх інвеставанне. Прагнучы вялікіх прыбыткаў (такія дывідэнды, сапраўды, у стане «знесці» галаву), сярод «пагарэльцаў» апынуліся нават старыя людзі, якія не толькі на словах былі знаёмыя з «фінансавымі пірамідамі». Так, напрыклад, сярод пацярпелых, паводле інфармацыі расійскіх праваахоўнікаў, — і пенсіянерка Людміла Траццякова, якая прынесла ў фірму 60 тысяч расійскіх рублёў. Дарэчы, да пачатку гэтага года махляры пацешылі яе нават дывідэндамі, выплаціўшы за месяц 8 тысяч рублёў. Аднак згубіла няшчасная куды болей — 52 тысячы.

— Калі арганізацыя гарантуе даходнасць у 25—50 працэнтаў гадавых, — гэта павінна насцярожваць патэнцыйных укладчыкаў, — заўважыў у гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення валютнага рэгулявання і валютнага кантролю Нацыянальнага банка Беларусі Сяргей Гайко. — Нават даход у 20 працэнтаў — нерэальны, таму што пры стаўцы рэфінансавання ў 10—12 працэнтаў дэпазітны рынак можа дадаць максімум 5 працэнтаў. Усё, што вышэй — рызыкоўна. І, натуральна, усё вельмі заманлівае можа быць небяспечным.

І яшчэ якім небяспечным! Урон, нанесены людзям «РуБінам» ацэньваецца ў... некалькі мільярдаў расійскіх рублёў. Што ж датычыцца заснавальнікаў фірмы, то прыкрыўшы свой офіс, яны «зніклі ў невядомым напрамку». Будзе не вельмі суцяшальным для тых беларусаў, якія сталі ўкладчыкамі названай кампаніі і тое, што шанцы вярнуць свае грошы — даволі нізкія: як правіла, махляры не пакідаюць ніякіх дакументаў, якія б іх выкрывалі. Аднак, калі ўдасца адшукаць прайдзісвета і ў яго знойдзецца маёмасць, якая можа быць канфіскавана для кампенсацыі пацярпелым, то ўкладчыкі могуць разлічваць на вяртанне часткі сродкаў паводле рашэння суда. Між іншым, як паведамілі нашаму карэспандэнту ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Беларусі, пакуль да беларускіх праваахоўнікаў ніхто з нашых грамадзян па дадзеным факце не звярнуўся, як і не паступалі ў міністэрства па гэтай справе запыты ад расійскіх калег.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

### БЫВАЙЦЕ, ЦЯЛЯТЫ!

Невядомы залез ноччу ў цялятнік саўгаса-камбіната «Мір», што ў Баранавіцкім раёне, і выкраў пяць цялят. Гаспадарцы нанесены страты ў памеры 20 млн рублёў. Злодзея можа і знойдуць, а цялят наўрад ці.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

Лёсы

## НОВАЕ ЖЫЦЦЁ СВЯТЛАНЫ ФЯДЗЯЧАНКІ

**Ніколі не позна пачаць наноў — у гэтым упэўнілася даярка з быхаўскай вёскі Чырвоны Бераг, якая пяць гадоў таму страціла, а цяпер вярнула ў сям'ю сваіх дзяцей.**



**Маці з малодшым сынам: «Я выбрала дзяцей!»**

Гэта будзе іх першае сумеснае веснавое свята. 8 сакавіка яны разам сходзяць у вясковы клуб на канцэрт, а потым збяруцца за святочным сталом з тортам і ліманадам «сваім колам». Святлана Фядзячанка і вакол пяць яе дзяцей: дарослы Віктар, старэйшыя школьнікі Аксана і Дзіма, 5-класнік Алег і 4-гадовы пястун Арцёмка.

— Мы цяпер сваёй сям'ёй! — радасна і ўсё яшчэ крыху сарамліва ўсміхаецца Святлана.

Што ж, ёсць розныя жыццёвыя гісторыі. Прыемна пісаць пра паспяховых людзей, якія дамагаюцца ў жыцці пастаўленых мэтаў. Што-небудзь пра заможных і знакамітых, якія тым не менш таксама плачуць, але перадольваюць цяжкасці. А тут зусім іншыя абставіны: бедная вёска ў глыбінцы, сялянская сям'я, гвалт і п'янства, падзенне ў багну... Але happy end ад такога, прама скажам, не самага відовішчнага інтэр'еру не становіцца менш каштоўным. Нават наадварот.

Сімпатычны малы Арцёмка, усмешлівы хлопчык, неўтаймаваны аматар да ўсяго новага і цікавага, якога браты і сястра ласкава завуць «прышпільным». Ці можна ўявіць, што ўпершыню, калі не лічыць дня нараджэння, ён убачыў сваю маці толькі паўгода таму?




**Такія лісты пісала дадому Аксана з дома-інтэрната: дзяўчынка верыла, што маці яе забярэ дадому, і надзеі ўрэшце спраўдзіліся.**

Святлана нарадзіла яго ў хаце, і праз суткі немаўля забралі з праблемнай сям'і ў Дом дзіцяці. Наступная сустрэча жанчыны з малодшым сынам адбылася праз 4 гады.

— Я па яго прыехала ў Магілёў, а мне кажуць — давайце адзежу, — узгадвае і плача Святлана. — А я кажу: пакажыце дзіця, які ён там — якога росту, тоўсты ці хударлявы... А Арцёмка адразу абняў мяне і назваў мяне мамай, з першага дня. Страшна, калі дзеці растуць без маці. Мне было без іх вельмі цяжка.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

## НАШ НОВЫ ПРАЖЫТКОВЫ МІНІМУМ: УСЁ ТОЕ Ж ПЛЮС СПОРТ?

### Дэпутаты прапанавалі ўключыць у яго расходы на аздараўленне

**2008 год аб'яўлены Годам здароўя, тым не менш у асноўных заканадаўчых актах, якія рэгулююць фізічную культуру і спорт, адсутнічае такое паняцце, як масавая фізкультура. Выправіць заканадаўчыя недахопы і збіраюцца дэпутаты Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, якія на мінулым тыдні наведалі Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры і азнаёміліся са спартыўнай базай Лагойскага раёна.**

**Сёлета і ў наступным развіццё масавага спорту будзе прафінансавана, і ў будучым у бюджэт пражытковага мінімуму будуць уключаны расходы на фізкультурна-аздараўленчыя мерапрыемствы, спартыўныя базы гарадоў і раённых цэнтраў будуць аднаўлены, а школьныя праграмы па фізічнай культуры — перагледжаны. Аб будучым масавай фізкультуры і спорту мы распыталі дэпутатаў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Алу РАЛЬКЕВІЧ і Таццяну ПРЫГОЖУЮ і міністра спорту і турызму Аляксандра ГРЫГАРАВА.**

**Ала РАЛЬКЕВІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дэмаграфічнай бяспецы і сацыяльным развіцці:**

— Яшчэ ў 2005 годзе кіраўнік нашай дзяржавы, выступаючы ў парламенце, вызначыў здароўе нацыі прыярытэтным напрамкам развіцця. Цяпер мы паглядзелі, як працуе наша заканадаўства і прыйшлі да высновы, што тут патрабуюцца карэктывы. У самых эканамічна развітых краінах свету 40—50 працэнтаў насельніцтва лічаць заняткі фізкультурай і спортам асновай жыцця. Мы сёння з горыччу павінны канстатаваць той факт, што нягледзячы на ўсе намаганні дзяржаўнай палітыкі, у нас гэта лічба не перавышае 14 працэнтаў. Даказана, што чалавек, які займаецца спортам, удвая менш хварэе на грып, у 2,5 раза менш бывае на бальнічным. Гэта і эканамічная выгада для дзяржавы.

***— Ці не надышоў, на ваш погляд, час увесці ў школьную праграму прадмет па якім-небудзь відзе спорту, скажам, футболе, як гэта зроблена ва Украіне, ці настольным тэнісе, як у Кітаі?***

— Як дырэктар гімназіі, я адзначыла б, што ў школах у нас нарматывы, якія не вельмі адпавядаюць патрабаванням часу. Не ўсе нашы школьнікі вызначаюцца выдатным здароўем і могуць іх выканаць. Адзін з прыярытэтных напрамкаў — масавыя гульнявыя віды спорту: валейбол, футбол, гандбол, баскетбол, хакей, нават тэніс. Яны сёння ў рознай ступені, але папулярныя сярод моладзі. Праўда, тут многае залежыць ад умоў і магчымасцяў рэгіёнаў.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

## Бухгалтерский баланс ЗСАО «БелИнгострах» за 2007 год

БЕЛИНГОСТРАХ Belingostrakh

**г. Минск, ул. Мясникова, 40, тел. (017) 203 58 78**

*млн руб.*

| АКТИВ | | ПАССИВ | |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Основные средства | 3 822,6 | Источники собственных средств, всего | 6 294,0 |
| Нематериальные активы | 6,3 | В том числе: | |
| Финансовые вложения — всего | 6,8 | уставный фонд | 1 751,2 |
| В том числе: | | резервный фонд | 0,0 |
| инвестиции в дочерние общества | 0,0 | добавочный фонд | 3 987,3 |
| инвестиции в другие организации | 6,8 | фонд накопления | 407,6 |
| облигации и другие долговые обязательства | 0,0 | фонд потребления | 0,0 |
| прочие финансовые вложения | 0,0 | целевое финансирование | 0,0 |
| Доля перестраховщиков в страховых резервах | 421,5 | нераспределенная прибыль прошлых лет | 27,5 |
| Дебиторы — всего | 443,8 | нераспределенная прибыль отчетного года | 120,4 |
| В том числе: | | Страховые резервы и фонды, всего | 2 673,1 |
| дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования | 240,7 | В том числе: | |
| | | страховые резервы | 2 637,8 |
| | | фонд предупредительных (превентивных) мероприятий | 35,3 |
| депо премий по рискам, принятым в перестрахование | 0,0 | гарантийные фонды | 0,0 |
| дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования) | 203,1 | Кредиторы — всего | 232,7 |
| Прочие активы — всего | 3 690,8 | В том числе: | |
| В том числе: | | кредиторская задолженность по операциям страхования | 81,6 |
| незавершенное строительство | 0,0 | | |
| материальные ценности и затраты | 202,3 | кредиторская задолженность по операциям перестрахования | 54,7 |
| денежные средства | 3 488,5 | депо премий по рискам, переданным в перестрахование | 0,0 |
| собственные акции (доли) | 0,0 | заемные средства | 0,0 |
| прочие активы | 0,0 | кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования) | 96,4 |
| Непокрытые убытки прошлых лет | 0,0 | | |
| Непокрытые убытки отчетного года | 906,7 | Прочие пассивы | 98,7 |
| **БАЛАНС** | **9 298,5** | **БАЛАНС** | **9 298,5** |

## Отчет о финансовых результатах ЗСАО «БелИнгострах» за 2007 год

*млн руб.*

| *Наименование показателя* | *За отчетный период* |
|---|---|
| *1* | *3* |
| **I. Страхование жизни** | 0,0 |
| Страховые взносы (премии) | 0,0 |
| Страховые выплаты | 0,0 |
| Изменение резерва по страхованию жизни (+ или -) | 0,0 |
| Отчисления в гарантийный фонд | 0,0 |
| Расходы на ведение дела | 0,0 |
| Результат от операций по страхованию жизни (+ или -) | 0,0 |
| **II. Страхование иное, чем страхование жизни** | |
| Страховые взносы (премии) нетто-перестрахование | 3 127,5 |
| Изменение резерва незаработанной премии — нетто-перестрахование (+ или -) | -320,1 |
| Оплаченные убытки (страховые выплаты) — нетто-перестрахование | 1 318,4 |
| Изменение резервов убытков — нетто-перестрахование (+ или -) | 491,2 |
| Изменение других технических резервов (+ или -) | 0,0 |
| Изменение иных страховых резервов (+ или -) | 0,0 |
| Отчисления в фонд предупредительных (превентивных) мероприятий и гарантийные фонды | 77,6 |
| Расходы на ведение дела | 1 393,6 |
| Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование | 143,3 |
| Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование | 138,7 |
| Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+ или -) | 513,6 |
| **III. Прочие доходы и расходы, не отнесенные в разделы I и II** | |
| Операционные доходы | 1 906,1 |
| Операционные расходы | 1 673,0 |
| Внереализационные доходы | 255,6 |
| Внереализационные расходы | 881,9 |
| Нераспределенная прибыль (убытки) отчетного периода (+ или -) | 120,4 |

**Генеральный директор** **А.К. ХОМЯКОВ.**
**Главный бухгалтер** **О.И. КУРЬЯН.**

**Достоверность бухгалтерского баланса и отчета о финансовых результатах подтверждена ОДО «Промаудит».**

Мы проводили аудит в соответствии с Законом Республики Беларусь «Об аудиторской деятельности», республиканскими правилами аудиторской деятельности, внутрифирменными правилами аудиторской деятельности, нормативными правовыми актами, регулирующими деятельность аудируемого лица.

Мы полагаем, что проведенный аудит дает достаточные основания для выражения аудиторского мнения о достоверности во всех существенных отношениях бухгалтерской (финансовой) отчетности ЗСАО «БелИнгострах» и соответствии совершенных им финансовых (хозяйственных) операций законодательству Республики Беларусь.

По нашему мнению, бухгалтерская (финансовая) отчетность ЗСАО «БелИнгострах» отражает достоверно во всех существенных отношениях его финансовое положение на 1 января 2008 года и результаты финансово-хозяйственной деятельности за 2007 год.

**Директор «Промаудит»** **аудитор А.В. Анисович.**
**Аудиторы:** **И.А. Бич, О.Г. Дроздов.**

УНП 100219645

## КУРСЫ ВАЛЮТ

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 6.03.2008 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 146,00 |
| 1 еўра | 3 255,59 |
| 1 латвійскі лат | 4 666,74 |
| 1 літоўскі літ | 942,78 |
| 1 чэшская крона | 130,40 |
| 1 польскі злоты | 922,44 |
| 1 расійскі рубель | 89,24 |
| 1 украінская грыўня | 425,14 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 24,0473 |
| 10 UAH | 47,1978 |
| 1000 BYR | 11,1965 |
| EUR | 36,4918 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 5.03.2008 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

ISSN 1990 - 763X
08044>

